УДК 929:008(476)"19/20"Дарашэвіч Э.К.

# Даніна павагі і ўдзячнасці (да 85-годдзя Энгельса Дарашэвіча)



*Дарагі Энгельс Канстанцінавіч!*

*Прыміце самыя сардэчныя віншаванні з юбілеем ад рэктарата, супрацоўнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.*

*Мы высока цэнім Ваш асабісты ўклад у развіццё нацыянальнай культуры, навукі і адукацыі, у станаўленне і ўмацаванне навуковых школ універсітэта.*

*Мы ведаем Вас як выдатнага вучонага, які сыграў важную ролю ў развіцці шэрагу напрамкаў гуманітарных ведаў у нашай краіне. Вы з'яўляецеся аўтарам навуковых прац, многія з якіх сталі вызначальнымі ў развіцці нацыянальнай школы даследаванняў у галіне гісторыі філасофіі, беларускай эстэтыкі, фалькларыстыкі, культуралогіі.*

*Вы выхавалі пакаленні таленавітых вучняў, плённа працуючых у сферы адукацыі і навукі, якія актыўна развіваюць Вашы ідэі і канцэпцыі.*

*Мы ўдзячныя Вам за ўвагу, якую Вы пастаянна ўдзяляеце развіццю навуковага патэнцыялу ўніверсітэта, уносіце вялікі ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных навуковых кадраў. Ваша плённая навуковая і адукацыйная дзейнасць садзейнічае ўзмацненню ролі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў як цэнтра гуманітарных ведаў, культуралагічнай і мастацкай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.*

*Жадаем Вам моцнага здароўя, дабрабыту, рэалізацыі навуковых і творчых планаў, новых поспехаў на карысць нашай Радзімы.*

*З глыбокай павагай, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў* ***Ю. П. Бондар.***

Энгельса Дарашэвіча – выдатнага даследчыка гісторыі філасофскай думкі Беларусі, аднаго з заснавальнікаў беларускай культуралогіі, сацыёлага культуры, педагога і знакамітага фалькларыста – ведаюць не толькі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, у якім ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плённа працуе, а і шматлікая навуковая супольнасць Беларусі і замежжа. Сёлета, у кастрычніку, у сувязі з 85-годдзем Э. К. Дарашэвіча гучаў ладны хор віншаванняў у бок прафесара, – даніна павагі і ўдзячнасці ад сяброў, калег і студэнтаў, для многіх з якіх ён з'яўляецца прыкладам самаадданасці адвечным каштоўнасцям навукі, духоўнасці і справядлівасці.

Энгельс Дарашэвіч нарадзіўся 26 кастрычніка 1931 г. у Мінску ў сям'і служачых. У Другую сусветную вайну сям'я была ў эвакуацыі, у тым ліку ў Сталінградзе, дзе яго маці працавала ваенным медыкам. Бацька Энгельса Канстанцінавіча загінуў, змагаючыся з акупантамі ў мінскім падполлі. Першай навучальнай установай была 42-я мінская школа (якая дала свету нобелеўскага лаўрэата Жорэса Алфёрава). Пасля сканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з 1953 г. выкладаў у Горы-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. З 1958 г. працаваў у Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук БССР. У тым жа годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Георгій Валянцінавіч Пляханаў пра французскі матэрыялізм XVIII ст.», а ў 1985 г. – доктарскую «Філасофія эпохі Асветы ў Беларусі». У 1984 г. Энгельс Дарашэвіч стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР за ўдзел у напісанні цыкла даследаванняў па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 1990 г. Энгельсу Дарашэвічу, прафесару Мінскага інстытута культуры, было прысвоена адпаведнае вучонае званне. Рэктар універсітэта Я. Д. Грыгаровіч з павагай ставілася да дасягненняў Дарашэвіча ў галіне гісторыі педагогікі і культуралогіі (даволі маладой галіны культуры ў той час) і запрасіла яго ва ўніверсітэт на асноўнае месца працы.

У 1990–2000-я гг. прафесар Э. К. Дарашэвіч працаваў у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (загадчыкам аддзела сацыялагічных даследаванняў ідэалагічных працэсаў Рэспубліканскага цэнтра сацыялагічных даследаванняў пры Інстытуце філасофіі і права, галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута сацыялогіі АН БССР) і ў сталічных установах вышэйшай адукацыі. Палявыя сацыялагічныя даследаванні і акадэмічныя поспехі трывала вывелі яго ў шэраг навукоўцаў, якія вывучаюць культуру на падставе даследавання артэфактаў, паводзінных праяў і дакументальных сведчанняў, а не выключна па другасных крыніцах. З 2009 г. ён працуе прафесарам кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, працягваючы падтрымліваць плённыя навуковыя сувязі з акадэмічнай навукай, калектывам Інстытута філасофіі НАН Беларусі, удзельнічае ў палявой экспедыцыйнай дзейнасці кафедры, кіруе дыпломнымі даследаваннямі выпускнікоў.

З юбілеем Вас, шаноўны Энгельс Канстанцінавіч!

***Кафедра этналогіі і фальклору БДУКМ***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ